View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

УДК 947.6 (=411.6) «1914/1916»

# ГРАМАДСКА–КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТУДЭНЦКАЙ І ВУЧНЁЎСКАЙ МОЛАДЗІ НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**М.В. Цуба[1], Н.М. Цуба[2]**
[1]Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,
[2]Сярэдняя школа № 14 г. Пінска, cubanm05@rambler.ru

У передваенны час праявіліся і пашырыліся розныя формы арганізацыі беларускай студэнцкай моладзі, якая займалася ў вышэйшых навучальных установах Пецярбурга, Масквы, Харкава, Рыгі, Варшавы і іншых гарадоў Расійскай імперыі. Адным з найбольш актыўных з’яўляўся "Беларускі літаратурна–навуковы гурток студэнтаў Санкт–Пецярбургскага універсітэта". Гэты гурток ўзнік па ініцыятыве студэнтаў Я.Хлябцэвіча і Б.Тарашкевіча, а кіраўніком яго быў абраны дацэнт А.А.Разенфельд. У 1912г. рэктарам універсітэта афіцыйна быў зацверджаны статут гуртка, дзе адзначалася, што мэтай гурткоўцаў было "навуковае азнаямленне з духоўным і грамадскім жыццём беларускага народа" [1, с. 59]. На сваіх паседжаннях гурткоўцы абмяркоўвалі рэфераты, даклады па пытаннях гісторыі, мовы, літаратуры, народнай творчасці і побыту беларускага народа. У рабоце гуртка ўдзельнічалі навукоўцы Б.Ш.Эпімах–Шыпіла, Я.Ф.Карскі, А.А.Шахматаў і іншыя. З чэрвеня 1914 года гурток пачаў выданне часопіса "Раніца" (Думкі беларускай студэнцкай моладзі). Аналізуючы дзейнасць беларускага студэнцкага руху часопіс пісаў: "Калі кінем вокам на жыццё беларускае сярод студэнтаў; калі прыгледзімся як адбіваецца ідэя адраджэння на моладзі; што робіць моладзь для краю і народу, то ўгледзім, што моладзь зварухнулася, што яна не закрывае вачэй, не адракаецца і не адварочваецца ад справы, а наадварот бярэцца да працы шчыра і ахвотна" [2, с.13].

Акрамя гэтага гуртка ў Пецярбурзе існавалі яшчэ "Беларускі студэнцкі хаўрус" пры Сельскагаспадарчым інстытуце, беларускі гурток пры Каталіцкай Духоўнай семінарыі і арганізацыя беларускіх студэнтак Пецярбургскіх жаночых курсаў. Напярэдадні вайны ў некаторых правінцыяльных гарадах таксама працавалі беларускія гурткі студэнтаў: пры Глухаўскім Настаўніцкім інстытуце на Чарнігаўшчыне, пры універсітэце ў Дэрпце, пры Феадосіеўскім Настаўніцкім інстытуце ў Крыме, пры інстытуце Сельскай Гаспадаркі ў Пулавах (Польшча), у Закаўказзі [3, с.3], ды нават у Чэхіі, у м. Табор [4, с.145].

Беларускі адраджэнскі рух развіваўся таксама сярод вучнёўскай беларускай моладзі сярэдніх школ Мінска, Вільні, Гродна і іншых гарадоў. Нацыянальна–свядомая вучнёўская моладзь не задавальнялася тымі ведамі, якія атрымлівала па школьнай праграме. Сярод навучэнцаў старэйшых класаў многіх беларускіх гарадоў распаўсюджвалася забароненая літаратура, ствараліся падпольныя бібліятэкі і гурткі самаадукацыі. Напрыклад, у Гродна пры мясцовай гімназіі ў 1909–1914гг. пад апякунствам ксяндза Ф.Грынкевіча працаваў гурток "Хатка". Можна меркаваць, што чынны ўдзел у рабоце гуртка прымаў Яраслаў Кастыцэвіч, адзін з будучых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, які ў 1908–1914гг. вучыўся ў Гродзенскай гімназіі [5, с.182]. Разам з выдавецкай дзейнасцю (гурток у 1913 годзе выдаў сваю газету "Колас беларускай нівы"), згуртаваная тут моладзь займалася і арганізацыйнай працай. Адбываліся сходы, гутаркі, наладжваліся беларускія вечарыны, пасля якіх усё больш моладзі далучалася да беларускай справы.

Царскія ўлады, а таксама вучэбнае начальства, імкнучыся не даць паўтарыцца рэвалюцыйным падзеям 1905–1907гг., рыхтаваліся да рашучага спынення магчымых хваляванняў сярод навучэнцаў. На пачатку 1911г. мінскі губернатар накіраваў пасланне дырэктару Мінскай мужчынскай гімназіі, у якім рэкамендаваў "узмацніць нагляд за настроем навучэнцаў і ўсімі мерамі імкнуцца не дапусціць склікання сходак". У сваю чаргу на падставе гэтага паслання дырэктар гімназіі аддаў указанне памочнікам класных настаунікаў "узмацніць нагляд за пазашкольнымі паводзінамі гімназістаў", адзначыўшы, што настаўнікі будуць несці строгую адказнасць за паводзіны навучэнцаў [6, арк.117]. Але і сярод значнай часткі настаўніцкай інтэлігенцыі захоўваліся таксама рэвалюцыйна–дэмакратычныя і нацыянальныя настроі [7, арк.776].

Ва ўмовах значнага пашырэння беларускага студэнцкага і вучнёўскага руху, маючы на мэце быць сувязным звяном паміж усімі гурткамі беларускай моладзі самых розных гарадоў, пецярбургскі часопіс "Раніца" ўскладаў на сябе наступную задачу: "Апошнімі часамі зарадзілася

Полесгу

думка, каб гэтыя ўсе гурткі злучыць якім–небудзь штабам, каб працаваць усім разам, каб не разбіваючы кожнага паасобку гуртка, выбраць агульны ўрад, які вёў бы агульнае студэнцкае беларускае жыццё" [2, с.14]. Магчыма, што гэтае імкненне пецярбургскіх студэнтаў–беларусаў магло б і збыцца, калі б не перашкодзіла вайна. Але ў перадваенны час такі цэнтр, які кіраваў беларускім жыццём, усё ж існаваў і ім была рэдакцыя "Нашай нівы". Нягледзячы на слабасць сваёй фінансавай базы яна аказвала падтрымку і ажыццяўляла сувязь амаль з усімі пералічанымі вышэй беларускімі гурткамі, арганізацыямі, і, па прызнанні часопіса "Саха", з’яўлялася "люстрам душы, думак і патрэб Беларусі" [8, с.1].

Вядомыя прадстаўнікі беларускага руху – Я.Купала, Я.Колас, Цётка, М.Багдановіч, браты А. і І.Луцкевічы, В.Ластоўскі, С.Палуян, А.Уласаў, К.Буйло, В.Іваноўскі, З. Бядуля, Л.Гмырак, У.Галубок, А.Гарун, М.Гарэцкі, Г.Леўчык і многія іншыя, аб’яднаныя вакол газеты “Наша ніва”, выступалі за адраджэнне беларускай літаратуры і мовы, за ўвядзенне яе ва ўжытак у школах і набажэнстве. Гэтыя патрабаванні яны разглядалі як арганічную частку нацыянальна–вызваленчай барацьбы, як галоўную ўмову ўсебаковага развіцця духоўнай культуры Беларусі і нацыянальнай самасвядомасці беларускай моладзі. Каб заявіць аб сабе і сваіх намерах, яны выкарыстоўвалі некаторыя міжнацыянальныя канферэнцыі, прымалі ўдзел у розных грамадска–палітычных мерапрыемствах, што праводзіліся ўладамі, каардынавалі дзейнасць самых розных па форме нацыянальных гурткоў, дзе надавалі асаблівую ўвагу студэнцкаму і вучнёўскаму руху.

Гістарычна вельмі важнай з’явай стала зараджэнне сістэмы беларускага школьніцтва, дзе беларуская мова асвойвала новую сферу бытавання. Патрэбна асабліва адзначыць, што адраджэнне беларускай школьнай справы ў заходніх губернях Беларусі пачалося істотна раней загада Гіндэнбурга, які быў выдадзены 16 студзеня 1916 года.

Яшчэ ў даваенны час існаваў, а затым меў працяг у даакупацыйны перыяд так называемы “беларускі пачын”. Сутнасць якога – гэта аказанне ў сельскай мясцовасці дапамогі нямоглым людзям, інвалідам, прастарэлым, а на пачатку вайны сем ям пайшоўшых на вайну альбо пацярпелым ад вайны. Дадзеная дапамога заключалася ў тым, што ствараліся добраахвотныя дружыны з былых настаўнікаў і вучняў старэйшых класаў, якія выконвалі ў блізляжачых ад Вільні вёсках неабходную работу ў полі і па дамашняй гаспадарцы, а ў свабодны час вучылі грамаце сялянскіх дзяцей. Вядома, што толькі ў Віленскім рэгіёне такім чынам працавала 30 дружын [9, л.73]. А затым дайшла справа да стварэння беларускіх пачатковых школ.

Такім чынам з кагорты студэнцкай і вучнёўскай моладзі перадваеннага часу затым вырасце вялікая плеяда беларускіх паэтаў, пісьменнікаў, навукоўцаў, настаўнікаў, прадстаўнікоў духавенства іншых грамадскіх і культурных дзеячаў, якія свядома і ўпэўнена павядуць сваю працу па шляху адраджэння беларускасці.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1.Семашкевіч, Р.М. Беларускі літаратурна–грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX – пачатак XX ст.) / Р.М.Семашкевіч. – Мінск: Выд–ва БДУ, 1971. – 136с.

2. К.Д. Беларуская ідэя і рух беларускі паміж студэнтамі // Раніца (Думкі беларускай студэнцкай моладзі). Пецярбург, – 1914 – N1 – с.13–14.

3. Беларусы ў Закаўказзі //Наша ніва. – 1911. – 7 красавіка.

4. Найдзюк, Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. / Я.Найдзюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 414 с.

5. Фёнік, Д. Яраслаў Кастыцэвіч (1896–1971) //Bialoruskie Zeszyty Historyezne. Red. J.Kalina. Bialystok / Д.Фёнік. – 1995. – N1(3). – ss.181–192.

6. Национальный архив Республики Беларусь(НАРБ). Фонд 295. – Оп.1.–С.7611.

7. НАРБ. Фонд 295.– Оп.1.– С.7509.

8. Рэклама на падпіску "Нашай нівы" на 1913 год //Саха. – 1912.– N7. – с.1.

9. Российский государственный исторический архив(РГИА). – Фонд 733. –Оп.196. – Д. – 948.